

КАШАПАРАЎ ПРА АДЗІНУЮ ЖОНКУ

Сямейная газета

ВАКОЛ СВЕТУ З ДРЭННЫМ ЗРОКАМ



Сямейная газета


Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ВЕРАСНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 173 (29040)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла КАНАНОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў:**

*«У пачатку гэтага года доля грамадзян ва ўзросце 60 гадоў і больш у агульнай колькасці насельніцтва Беларусі склала каля 22 %, да 2025 года гэты паказчык узрасце да 28 %. У сувязі з гэтым была пачата распрацоўка праекта нацыянальнай стратэгіі ў інтарэсах пажылых грамадзян, які будзе прадстаўлены на абмеркаванне ў кастрычніку—лістападзе. Сярод прапаноў у праект з боку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў — выкарыстанне механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы аказання медыцынскіх і сацыяльных паслуг для грамадзян сталага веку, падтрымка навуковых даследаванняў у галіне геранталогіі, укараненне ў навучальныя праграмы для моладзі курсаў па планаванні актыўнага даўгалецця. Разглядаліся таксама варыянты прыцягнення камерцыйных і некамерцыйных сетак для дастаўкі прадуктаў, аказання транспартных і бытавых паслуг па прынцыпе сацыяльнага прадпрымальніцтва».*

# УРАДЖАЙНАЕ СЭЛФІ




Фота БелТА.

**Сёлета студэнты Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны выехалі не «на бульбу», а «на буракі». Менавіта гэтыя караняплоды яны дапамагаюць убіраць у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Альгоўскае». Ураджай сталовых буракоў сёлета багаты — толькі за першы дзень работы хлопцы і дзяўчаты са студэнцкага дэсанта сабралі 55 тон. З такімі і сэлфі зрабіць не сорамна, лічаць Яна КАРОТКАЯ, Іна СТРАПКО і Наталля ЖЫЖКЕВІЧ.**

Харчовая бяспека

# БУЛЬБАЧКА ЎРАДЗІЛА,

## ды і яблыкаў з цыбуляй хопіць усім



Фота БелТА.

**Каб пазбегнуць перавытворчасці, прыватнікам рэкамендуюць аб'ядноўвацца ў асацыяцыі.**

**Сярэдняя ўраджайнасць «другога хлеба» — 365 цэнтнераў з гектара. Пакуль...**

Верасень традыцыйна лічыўся ў нас (тых, каму цяпер за 45—50) месяцам бульбы. Яе капалі школьнікі і студэнты, замест таго каб сядзець у класах ці аўдыторыях. Цяпер кожны займаецца сваёй справай. А ўраджайнасць бульбы сёлета вышэйшая за леташнюю нязначна — на 11 %, але ўсё ж...

СТАР. 4

Наш праект

# Конкурс апавяданняў «Звязды»: падводзім вынікі...

## Абвяшчаем новы этап

**Ужо шмат гадоў наша газета вядзе адмысловы творчы праект — конкурс апавяданняў, у якім па добрай традыцыі адточваюць пяро як маладыя, так і сталыя аўтары незалежна ад месца пражывання, літаратурнага вопыту і сукупнасці заслуг. Кожны твор, які друкуецца на старонках «Звязды», чымсьці адметны і цікавы, а часам і наватарскі. А галоўнае, спадзяёмся, кожны з іх не толькі прыносіць вопыт прыгожага пісьменства аўтару, але і знаходзіць свайго чытача.**

Выбіраць найлепшых у творчым спаборніцтве заўсёды цяжка, але неабходна. Сёлета ў вызначэнні пераможцаў зноў працавала кампетэнтнае журы, у склад якога ўвайшлі, у прыватнасці, вядучы конкурсу Алесь Бадак, а таксама галоўныя рэдактары літаратурна-мастацкіх выданняў Выдавецкага дома «Звязда».

СТАР. 13

## КОРАТКА

- У Аршанскім раёне да канца гэтага года плануюць увесці ў эксплуатацыю буйны малочнатаварны комплекс «Купалінка».
- **16 жыхароў Мінска старэйшыя за 90 гадоў афіцыйна працуюць, усяго ў сталіцы зарэгістравана 169 тысяч працаўладкаваных пенсіянераў.**
- Пасажырапаток у Нацыянальным аэрапорце Мінск у студзені — жніўні 2019 года павялічыўся амаль на 12 % у параўнанні з леташнім.
- **Карціну даўжынёй 250 метраў мастакі падораць Гродна да Дня горада. Палатном стане праезная частка.**


ISSN 1990 - 763X

19173>



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на IV квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!